# Сярэдняя спецыяльная адукацыя Савецкай Беларусі ў 20-х гг. XX ст.: гістарыяграфічны агляд

***А.М. Каспяровіч, г. Мінск***

Першымі публікацыямі аб сярэдніх спецыяльных навучальных установах у Савецкай Беларусі сталі артыкулы ў перыядычных выданнях 1920 – 1930 гг.. У часопісах «Асвета», «Камуністычнае выхаванне», «Полымя», «Школа і культура Савецкай Беларусі» змяшчаліся артыкулы, прысвечаныя праблемам развіцця сеткі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, пастаноўкі навучальнага працэсу ў іх, матэрыяльнага забеспячэння студэнтаў і выкладчыкаў, правядзенню нацыянальнай палітыкі. На працягу 1925 г. публікаваўся друкаваны орган Пралетарскага студэнцтва Беларусі – часопіс «Чырвоны сцяг», у якім асвятляліся пытанні прафсаюзнага жыцця тэхнікумаў [1]. На працягу 1920-х гг. выходзіў друкаваны орган НКА – «Вестник народного комиссариата просвещения ССРБ», дзе выдаваліся афіцыйныя пастановы і распараджэнні па народнай адукацыі [2].

Поўныя звесткі аб ліку тэхнікумаў, колькасным складзе іх студэнцкіх і выкладчыцкіх калектываў маюцца ў статыстычных даведніках і зборніках, якія выйшлі ў даваенны час. Да іх ліку можна аднесці «Эканамічна-статыстычны даведнік», зборнік «Белорусская ССР в цифрах», статыстычны зборнік «Культурное строительство в БССР» [3].

Літаратура 1920-х гг. з'яўляецца каштоўным канкрэтна-гістарычным матэрыялам. Але большасць публікацый названага перыяду маюць інфармацыйна-статыстычны характар прадстаўлення матэрыялу і толькі ў некаторых артыкулах рабіліся спробы крытычнага асэнсавання і ацэнкі працэсу развіцця сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Разам з тым неабходна адзначыць, што ацэнка і аналіз сучаснікаў адлюстроўвала тагачасную палітыку і ідэалогію дзяржавы ў галіне пабудовы сеткі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, фарміравання сацыяльнага і нацыянальнага складу студэнтаў і выкладчыкаў тэхнікумаў.

Большая частка даследаванняў па гэтай праблеме адносіцца да другой паловы XX ст. У гэты час савецкая гістарычная навука інтэнсіўна даследавала гістарычны вопыт стварэння і развіцця савецкай сістэмы адукацыі. Найбольш прыкметнымі працамі па названай тэме сталі даследаванні П.В. Саевіча «Народное образование за 30 лет», П.П. Сіліванчыка «Деятельность коммунистической партии Белоруссии по осуществлению культурной революции в республике (1919–1937 гг.)», Г.С. Маханька «Борьба Коммунистической партии Советского Союза за преодоление экономической и культурной отсталости белорусского народа (1928–1937)», дзе сярод іншага паказана праца партыйных і дзяржаўных органаў рэспублікі па стварэнні і развіцці сеткі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, падрыхтоўкі і выхавання настаўніцкіх кадраў [4]. Для ўсіх пералічаных прац характэрна асвятленне толькі пазітыўных вынікаў праводзімых савецкім урадам пераўтварэнняў у галіне народнай адукацыі. Аўтарамі падаюцца статыстычныя даныя і каменцірующца прынятыя партыйнымі і савецкімі органамі рашэнні. Тым не менш, статыстычныя звесткі па сярэдніх спецыяльных навучальных установах БССР у 20-х гг., студэнтах і выкладчыках у іх, якія прыводзяцца ў гэтых працах, нельга назваць поўнымі і яны патрабуюць удакладнення і дапаўнення.

Да гэтага перыяду адносіцца з'яўленне ў беларускай гістарыяграфіі шэрага фундаментальных прац і змястоўных публікацый па гісторыі адукацыі, у якіх закранаюцца пытанні развіцця сеткі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэхнікумаў у 20-х гг. XX ст. Да іх, безумоўна, можна аднесці работы І.М. Ільюшына і С.А. Умрэйкі «На родная асвета ў Беларусскай ССР», калектыўныя манаграфіі «Нарысы народнай асветы і педа гагічнай думкі ў Беларусі», «Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945)», прац Н.В. Васілеўскай «Формирование кадров производственно-технической интеллигенции БССР в пері од строительства социализма (1921–1941 гг.)» [5]. Усе гэтыя даследаванні ўтрымліваюць вялікі ста тыстычны матэрыял, што дазваляе падрабязна азнаёміцца з дзейнасцю суб'ектаў сістэмы адукацы Аўтарамі надаецца шмат увагі раскрыццю дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі і навуковаму аналіз сабранага фактычнага матэрыялу. Разам з тым па-за ўвагай даследчыкаў засталіся такія важныя пы танні грамадска-палітычнага жыцця тэхнікумаў у 20-я гг., як класавыя чысткі студэнцкага і выклад чыцкага складу тэхнікумаў, апазіцыйныя настроі да савецкай улады ў іх асяроддзі. Тлумачыцца гэта недаступнасцю шэрага архіўных фондаў для даследчыкаў у той час і немагчымасцю крытыкі прыня тых партыйнымі і дзяржаўнымі органамі рашэнняў.

Неабходна таксама адзначыць артыкулы З.М. Цітка і В.В. Сафонавай, у якіх разглядаюцца пра цэсы станаўлення і развіцця народнай адукацыі ў рэспубліцы ў 20-х гг. XX ст. Шмат увагі ў іх надаецца пытанням фарміравання сеткі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў [6].

Значнае месца ў распрацоўцы пытання падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў, у тым ліку і ў сярэдні спецыяльных педагагічных навучальных установах, належыць Я.К. Новіку, у прыватнасці яго фунда ментальнаму даследаванню «Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917–1941)» [7]. На багатым архіўным матэрыяле аўтар паказвае работу па фарміраванні педагагічных кадраў для агульнаадукацыйных школ, сярэдніх спецыяльных і прафесійных устаноў. Аўтарам высвят ляюцца формы і метады партыйнага кіраўніцтва па удасканаленні структуры і работы педагагічных на вучальных устаноў. Разам з тым, згодна з вызначанай аўтарам тэмай даследавання, у названай мана графіі разглядаецца праца толькі педагагічных сярэдніх спецыяльных устаноў.

Шмат увагі ў савецкі перыяд надавалася вывучэнню маладзёжнай палітыкі дзяржавы ў 20-я гады. У кнізе Навіцкага У.І. і Новіка Я.К. «Участие ленинского комсомола Белоруссии в борьбе за подъём народного образования 1920 – июнь 1941 гг.» і Бендзіна А.Ю. «Деятельность Компартии Белоруссии по идейно-политическому воспитанию студенческой молодёжи, 1928 – 1937 гг.» праз прызму дзейнасці партыйных і камсамольскіх арганізацый паказана праца па стварэнні ўсеагульнага абавязко вага навучання, падрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах [8].

Праблемы развіцця сярэдняй спецыяльнай адукацыі, у асноўным тэхнічнай, у пэўнай ступені закра наецца і даследчыкамі, якія вывучалі сацыяльна-эканамічныя працэсы, што адбываліся ў рэспубліцы ў 20–30-х гг. XX ст. Існуе пэўная колькасць прац, прысвечаных развіццю і ўдасканаленню падрыхтоўкі кадраў у гады першай пяцігодкі. Праца Э.Б. Яршовай прысвечана вывучэнню працэсаў падрыхтоўкі і выхавання кадраў для культурна-асветніцкіх устаноў у 1928–1932 гг. У сваім даследаванні Н.І. Лукашкоў асвятляе дзейнасць Кампартыі Беларусі па падрыхтоўцы інжынерна-тэхнічных кадраў у той жа перыяд [9]. Але зразумела, што праблема развіцця ССНУ у названых аўтараў не была асноўнай, а разглядалася ў шэрагу іншых фактараў, што ўплывалі на змены ў культурна-адукацыйным узроўні асобных груп насельніцтва.

У апошні час з'явіліся навуковыя даследаванні, якія больш аб'ектыўна асэнсоўваюць палітыку савецкай дзяржавы ў галіне адукацыі, у тым ліку і сярэдняй спецыяльнай. Звязана гэта ў першую чаргу з увядзеннем у навуковы ўжытак новых крыніц, крытычным пераасэнсаваннем ужо вядомых фактаў і вывадаў. У гісторыкаў з'явілася магчымасць на аснове працы з раней недаступнымі архіўнымі фондамі даследаваць такія маларапрацаваныя пытанні, як чысткі студэнцкага складу па сацыяльнай прыкмеце, правядзенне палітыкі беларусізацыі ў ССНУ, матэрыяльнае становішча і настроі студэнцкай моладзі. Такі падыход характэрны для дысертацыйных прац І.М. Раманавай «Фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі ў БССР. 1921–1930 гг.», Н.І. Куракевіч «Дзяржаўная палітыка ў галіне народнай адукацыі і падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў Беларусі (1921–1930 гг.)», М.М. Сакалова «Студенчество высшей школы Беларуси 20-х годов XX века». У іх аўтарамі ўпершыню пастаўлена пытанне аб супярэчлівасці савецкай палітыкі ў галіне адукацыі ў 20-я гг. XX ст., даецца крытычны аналіз класавай палітыкі па фарміраванні студэнцкіх калектываў [10]. Аднак у названых работах сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы асобна не вылучаліся, а разглядаліся толькі як частка сістэмы адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Неабходнай умовай усебаковага і аб'ектыўнага даследавання сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 20-я гг. XX ст. з'яўляецца вывучэнне таго вопыту, які быў назапашаны ў гэтым кірунку ў папярэдні час. Дысертацыйнае даследаванне Н.Я. Новік прысвечана вывучэнню стану прафесійнай адукацыі ў Беларусі ў другой палове XIX–пачатку XX ст. У ім, сярод іншага, асвятляецца стан сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, на базе якіх у першай палове 20-х гадоў пачынала будавацца савецкая сістэма сярэдняй спецыяльнай адукацыі [11].

Вывучэнне праблемы станаўлення і развіцця савецкай сістэмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 20-я гг. XX ст. мае вялікае значэнне для разумення працэсаў, якія адбываліся ў жыцці беларускага грамадства таго часу. Партыйна-дзяржаўная палітыка ў дачыненні да фарміравання сеткі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, іх студэнцкага складу, забеспячэння кадрамі выкладчыкаў, а таксама арганізацыя навучання і грамадска-палітычнае жыццё ў ССНУ да сённяшняга дня не былі аб'ектам самастойнага даследавання. Разам з тым існуе пэўная колькасць гістарычных даследаванняў, калектыўных прац, навуковых і публіцыстычных артыкулаў, якія закраналі асобныя аспекты названай праблемы.

Такім чынам, агляд гістарыяграфіі дае падставы сцвярджаць, што нягледзячы на даволі значную колькасць даследаванняў у названай галіне, многія моманты станаўлення і развіцця сістэмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў Савецкай Беларусі недастаткова даследаваны і патрабуюць далейшага вывучэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Літаратура*

1. Байкоў, Н. Пытанне беларускай культуры і шлях беларускай інтэлігенцыі / Н. Байкоў // Полымя. – 1923. – № 5–6, – С. 96 – 104; Платун, А. Аб падрыхтоўцы кадраў / А. Платун // Камуністычнае выхаванне. – 1930. – № 3. – С. 12 – 17; Праца польскага педагагічнага тэхнікума ў Мінску і яе сучасныя вынікі // Асвета. 1925. – № 5. – С. 123 – 125; Резолюция 2-го Всебелорусского съезда Советов по докладу о народном просвещении // Школа і культура Савецкай Беларусі. 1921, № 1–2, С. 74 – 75.
2. Профессионально-техническое образование // Вестник народного комиссариата просвещения ССРБ. 1921. – № 2. – С. 35.
3. Белорусская ССР в цифрах: К 10-летию существования БССР 1919–1929. / Центральное статистическое управление; БССР. Эканамічна-статыстычны даведнік. – Мінск: Сектар нар.-гасп. Уліку Дзяржплана, 1931. – 730 с.; Культурное строительство в БССР: стат. сб. – Минск: Изд-во УНХУ БССР, 1940. – 112 с.
4. Маханёк, Г.С. Борьба Коммунистической партии Советского Союза за преодоление экономической и культурной отсталости белорусского народа (1928 – 1937): автореф. дис. … канд. ист. наук / Г.С. Маханёк. Киев, 1953. – 21с.; Саевич, П.В. Народное образование за 30 лет / П.В. Саевич. – Минск: Госиздат БССР, 1948. – С. 47.; Силиванчик, П.П. «Деятельность коммунистической партии Белоруссии по осуществлению культурной революции в республике (1919–1937 гг.) / П.П. Силиванчик. – Минск: Изд-во БГУ, 1961. – С. 235.
5. Василевская, Н.В. Формирование кадров производственно-технической интеллигенции БССР в период строительства социализма (1921 – 1941 гг.) / Н.В. Василевская. – Минск: Наука и техника. – 1986. – 157 с.; Ільюшын, І.М. і Умрэйка, С.А. Народная асвета ў Беларусскай ССР / І.М. Ільюшын, С.А. Умрэйка. – Мінск: Учпедгиз, 1961. – 438 с.; Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917 – 1945) / пад рэд.: Г.Р. Сянкевіча, Л.П. Лыча; А.Г. Андрэевай. – Мінск: Народная асвета, 1993. – 495 с.; Нарысы народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / С.А. Падокшын, В.І. Мялешка, Г.Р. Сянкевіч, А.І. Мальдзіс. – Мінск: Наука и техника. – 1968. – 612 с.
6. Сафонава, В.В. Ад усеагульнай да бесперапыннай: Адукацыя рэспублікі з пачатку 20-х да канца 80-х гг. / В.В. Сафонава // Настаўніцкая газета. 1990. – 28 ліпеня. – С.4.; Титок, З.М. Школа Белоруссии в период гражданской войны и восстановления народного хозяйства (1917 – 1925): автореф. дис. … канд. пед. наук: 13. 00. 01. / З.М. Титок; МГПИ – Минск, 1977. – 12 с.
7. Новик, Е.К. Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917 – 1941) / Е.К. Новик. – Минск: Наука и техника. – 1981. – 295с.
8. Новицкий, В.И., Новик, Е.К. Участие ленинского комсомола Белоруссии в борьбе за подъём народного образования 1920 – июнь 1941 гг. / В.И. Новицкий, Е.К. Новик. – Минск: Наука и техника. – 1979. – 272 с.; Бендин, А.Ю. «Деятельность Компартии Белоруссии по идейно-политическому воспитанию

студенческой молодёжи, 1928 – 1937 гг.: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07. 00. 01. / А.Ю. Бендин
Бел. Гос. Ун-т. – Минск. 1989. – 22 с.

9. Ершова, Э.Б. Деятельность коммунистической партии Белоруссии по подготовке и воспитанию кад
ров для культурно-просветительных учреждений в годы первой пятилетки (1928 – 1932 гг.): дис. .
канд. ист. наук. 07. 00. 01. – Минск, 1979. – 181 с.; Лукашков, Н.И. Деятельность компартии Белорусси
по подготовке инженерно-технических кадров в годы первой пятилетки (1928 – 1932 гг.). автореф
дис. ... канд. ист. наук: 07.570 / Н.И. Лукашков ; Бел. Гос. Ун-т. – Минск. 1972. – 24 с.

10. Раманава, І.М. Фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі ў БССР. 1921 – 1930 гг.: аўтарэф. дыс. .
канд. гіст. навук: 07. 00. 02 / І.М. Раманава; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск. – 1999. -
19 с.; Куракевіч, Н.І. Дзяржаўная палітыка ў галіне народнай адукацыі і падрыхтоўка настаўніцкіх кад
раў Беларусі (1921 – 1930 гг.): дыс. ... канд. гіст. навук / Н.І. Куракевіч. – Мінск, 2002. – 120 с.; Соколов, М.Н
«Студенчество высшей школы Беларуси 20-х годов XX века. автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07. 00. 02.
М.Н. Соколов; Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Минск. – 2002. – 22 с.

11. Новик, Н.Е. Профессиональное образование в Белоруссии во второй половине XIX – начале XX века
автореф. дис. ... канд. ист. наук / Н.Е. Новик. – Минск: БГУ. – 1998. – 19 с.